Ураджай-2023

# У заліку — больш за паўмільёна

**Аграрыі Віцебшчыны падвялі ўрачыстую мяжу ўборачнай кампаніі — 2023 абласным святам працаўнікоў вёскі «Дажынкі». Сёлета паўночны рэгіён сабраў рэкордныя для гэтага года 624 тысячы тон збожжа і нарыхтаваў максімум зборжжасенажу. Канчатковыя ўборачныя вынікі вобласць падвядзе ў лістападзе, 261 экіпаж хлебаробаў дасягнуў намалоту ў тысячу тон, 26 — узялі двухтысячную вяршыню, Максім СЯРНОЎ з ААТ «Агракамбінат «Юбілейны» Аршанскага раёна адзіны ў рэгіёне намалаціў звыш трох тысяч тон.**


Фота БелТА.

«Дажынкі» ў Шаркаўшчыне пачаліся з ушанавання памяці героаў-вызваліцеляў, якія абаранялі раён у гады Вялікай Айчыннай вайны. Сёлета шаркаўчане адзначаюць і 520-ю гадавіну з дня заснавання пасёлка. На старонках яго летапісу былі і радасці росквіту, і горыч ваеннай навалы. Кіраўніцтва вобласці і шматлікія госці схілілі галовы ў хвіліне маўчання каля брацкай магілы на гарадской плошчы і ўсклалі кветкі ў памяць воінаў.

Галоўнае аграрнае свята Шаркаўшчына чакала даўно, як і яе жыхары, бо гэта не толькі вялікі гонар, але і свежы глыток паветра для інфраструктуры і ўстаноў. Так, да «Дажынак» абнавіліся 180 аб'ектаў, у ліку якіх — сярэдняя школа № 1. Ва ўстанове, якая адзначае 50-годдзе, быў праведзены капітальны рамонт з мадэрнізацыяй, і на свяце яна атрымала статус «Школа будучыні». Урачыста адкрылі новы 40-кватэрны дом для маладых спецыялістаў і тых грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Гэта першы дом у Шаркаўшчыне, у якім ёсць ліфт — доўгачаканая для ўсіх жыхароў падзея. Да абласных «Дажынак» на Віцебшчыне ў абноўленым будынку Шаркаўшчынскага раёна электрычных сетак адкрыўся разліковa-касавы цэнтр РУП «Віцебскэнерга». У мерапрыемстве ўзяў удзел **міністр энергетыкі Віктар КАРАНКЕВІЧ**. Вядуцца работы па мадэрнізацыі спартыўнай пляцоўкі, раённага Цэнтра рамёстваў, Цэнтра культуры, іншых важных аб'ектаў. Абноўлены фасады будынкаў кансервавага завода, гасцініцы, камбіната бытавога абслугоўвання, аўтастанцыі, пошты, цэнтра банкаўскіх паслуг, архіва. Каля ўсіх будынкаў добраўпарадкаваны прылеглыя тэрыторыі, адрамантаваны дарогі, пакладзена 155 тысяч квадратных метраў асфальтавага пакрыцця. Праведзены рамонт 27 прыдамавых тэрыторый, 12 аб'ектаў гандлю спажывецкай кааперацыі, 22 суб'ектаў прыватнай формы ўласнасці, добраўпарадкавана тэрыторыя рынку, адкрыта новае кафэ.

«Усё, што зроблена, застаецца людзям. І гэта галоўнае. Пераўтварэнне гарадскога пасёлка працягнецца і пасля фестывалю», — адзначыў **старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН**. Так, у пачатку 2024 года будзе ўведзены ў эксплуатацыю новы корпус Аляксандраўскага псіханеўралагічнага дома-інтэрната для састарэлых і інвалідаў. Будзе адкрыты мост па вуліцы Краснадарскай, працягнецца капітальны рамонт раённага цэнтра культуры. Для прыхільнікаў здаровага ладу жыцця і аматараў спорту будзе пабудаваны шматфункцыянальны фізкультурна-аздараўленчы комплекс.

Гаворачы аб пераўтварэнні сталіцы цяперашніх «Дажынак» — Шаркаўшчыны, — старшыня аблвыканкама выказаў словы падзякі і ўдзячнасці будаўнікам, работнікам камунальных службаў, дарожнікам — усім, хто ўдзельнічаў у падрыхтоўцы райцэнтра да свята.

Па абодвух берагах ракі раскінуліся інтэрактыўныя пляцоўкі і гасцінныя падворкі ўстаноў і арганізацый вобласці. Тут была прадстаўлена рэтра- і сучасная сельскагаспадарчая тэхніка, але найбольш уразіў аўдыторыю, асабліва дзіцячую, цукеркавы дождж з камбайна. Не абышлося без галоўнага сімвала жніва — паўтараметровага пяціярусная караваю з мукі новага ўраджаю.

На галоўнай сцэне свята адбылася цырымонія ўзнагароджання найлепшых аграрыяў паўночнага рэгіёна, якія сёлета дасягнулі высокіх сельскагаспадарчых вынікаў. З прывітальным словам да хлебаробаў і гасцей звярнуўся Аляксандр Субоцін. «Сучасны Шаркаўшчынскі раён — гэта ў першую чаргу сельскагаспадарчы раён. Сельскі ўклад жыцця падарыў гэтай мясцовасці тонкае зачараванне глыбінкай, дзе ўмеюць шанаваць працу на зямлі і аддаваць гонар сабранаму ўраджаю. Мы працуем ва ўмовах рызыкоўнага земляробства — спадзявацца і чакаць падарунка ад прыроды не варта. Умовы гэтага года яшчэ раз пацвердзілі, што найлепшы вынік атрымлівае той, хто больш строга выконвае тэхналогію, шырока выкарыстоўвае дасягненні аграрнай навукі, прымяняе высокаўраджайныя сарты культур, працуе на высокапрадукцыйнай тэхніцы. Сацыяльна-эканамічная стабільнасць дзяржавы падмацоўваецца харчовай бяспекай, яна залежыць ад укладу кожнага, ад умення любіць сваю справу і сваю Радзіму. Сельская гаспадарка служыць сыравіннай асновай для прадпрыемстваў харчовай, лёгкай прамысловасці, на долю якіх прыпадае амаль чвэрць аб'ёмаў вытворчасці прамысловай прадукцыі вобласці. Дзейнасць усіх асноўных сфер эканомікі Віцебшчыны прыбытковая, а прадукцыя прадпрыемстваў запатрабаваная. Паважаныя аграрыі, ваша праца мае вялікае значэнне для развіцця эканомікі вобласці і сацыяльнай стабільнасці ў рэгіёне. Жадаю вам моцнага здароўя, шчасця, поспехаў у дасягненні пастаўленых мэт і заваяванні новых вышынь! Міру і дабрабыту!»



Прывітальны адрас **кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Ігара СЕРГЕЕНКІ** зачытаў **начальнік Галоўнага ўпраўлення кадравай палітыкі Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксей ГУЙДА.**

Ганаровыя граматы і падзякі атрымалі перадавікі сельскагаспадарчай нівы вобласці, у іх ліку — працаўнікі прадпрыемстваў, якія з году ў год маюць высокія вынікі па намалоце збожжа: ААТ «Хацілыагра» і «Навасёлкі-Лучай» Пастаўскага раёна; СВК «Ларынаўка» Аршанскага раёна; Талачынскі кансервавы завод; Віцебская бройлерная птушкафабрыка; ААТ «Шайцерава» Верхнядзвінскага раёна; «Мазалавагаз» Віцебскага раёна.

Яркім акордам першага дажыначнага дня стаў канцэрт Анатоля Ярмоленкі і ансамбля «Сябры», вечарам неба над пасёлкам заззяла агнямі салюту.

У наступным годзе абласны фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі пройдзе ў гарадскім пасёлку Бешанковічы. А гэта значыць, здзейсніцца новы рывок у трансфармацыі інфраструктуры і грамадскіх прастор.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

Сталічны час

# Жыллё для шматдзетных і арэнднае

## Учора на аператыўнай нарадзе ў Мінскім гарвыканкаме абмяркоўвалі жыллёвыя пытанні

**У прыватнасці, аб выніках забеспячэння жыллём шматдзетных сем'яў сталіцы расказала начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Мінгарвыканкама Алена ЛУКАШЭВІЧ.**


Фота БелТА.

Дынамічна зніжаецца чарга шматдзетных сем'яў на будаўніцтва жылля ў сталіцы. Цяпер у гэтай чарзе стаяць 4374 шматдзетныя сям'і, з іх сталі на ўлік сёлета 652. Як адзначыла Алена Лукашэвіч, доўгія гады гэтая колькасць складала 1—1,3 тысячы сем'яў.

«Сёння 2628 шматдзетных сем'яў паляпшаюць жыллёвыя ўмовы, 1288 адмовіліся ад прапанаваных варыянтаў паляпшэння жыллёвых умоў», — удакладніла начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Мінгарвыканкама.

Сярод распаўсюджаных прычын адмовы — незадаволенасць раёнам будаўніцтва жылля. Да нядаўняга часу вострай праблемай для шматдзетных сем'яў была абавязковая купля паркавальнага месца пры набыцці кватэры. Цяпер гэта праблема вырашылася. Амаль 70 працэнтаў шматдзетных сем'яў, якія ўжо маюць ва ўласнасці жыллё, не маюць сродкаў на даплату для будаўніцтва поўнагабарытнай кватэры па нарматыве, паколькі дзяржпадтрымка даецца за вылікам памеру існуючай уласнасці.

Паводле слоў Алены Лукашэвіч, шматдзетныя сем'і паляпшалі жыллёвыя ўмовы шляхам долевага будаўніцтва ў Мінску, Смалявічах і іншых гарадах з насельніцтвам да 20 тысяч чалавек, забяспечваліся сацыяльным жыллём, ім таксама былі прададзены кватэры ў Мінску і Смалявічах. «Найбольш папулярны продаж. Людзі з задавальненнем згаджаюцца на ўжо гатовыя кватэры. Гэта дазволіла нам накіраваць на паляпшэнне жыллёвых умоў 1064 сям'і, на гэтыя мэты выкарыстана 1190 кватэр, паколькі вялікім сем'ям з колькасцю больш за дзевяць-дзесяць чалавек прадастаўлялася па дзве кватэры», — растлумачыла начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Мінгарвыканкама.

Як вынік — Мінгарвыканкам перавыканаў прагнозны паказчык. За справаздачны перыяд стаяла задача забяспечыць жыллём 1 тысячу шматдзетных сем'яў. На сёння фактычнае выкананне складае 106,4 працэнта. «Работа ў гэтым напрамку будзе прадоўжана. Да канца года мы ўвядзём яшчэ каля 1 тыс. кватэр, будзем аддаваць шматдзетным сем'ям», — сказала Алена Лукашэвіч.

У 2023 годзе ўстойлівым попытам у сталіцы карысталася арэнднае жыллё. Як растлумачыла Алена Лукашэвіч, у адпаведнасці з заканадаўствам 60 працэнтаў усяго вызваленага або пабудаванага арэнднага жылля даецца чаргавікам агульнай групы, 10 працэнтаў накіроўваецца на забеспячэнне жыллём ваеннаслужачых дзяржаўных органаў і 30 працэнтаў выдзяляецца для патрэб першачарговых катэгорый па месцы працы. На сёння першачаргавікам у сталіцы ўжо дадзена 55 жылых памяшканняў, 85 кватэр выдзелена чаргавікам па месцы працы і 80 кватэр аддадзена для патрэб чаргавікоў агульнай чаргі.

Начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Мінгарвыканкама заўважыла, што ажыццяўляецца будаўніцтва 147 новых арэндных кватэр у жылых дамах у мікрараёне Сокал і на вул. Акадэміка Купрэвіча.

Расказваючы аб тым, якіх вынікаў удалося дасягнуць у рабоце па паляпшэнні жыллёвых умоў чаргавікоў Мінска, як тых, хто стаіць на ўліку па месцы жыхарства ў адміністрацыях раёнаў, так і тых, хто стаіць на такім уліку па месцы працы або службы, Алена Лукашэвіч падкрэсліла, што ў прыярытэце дзяржаўнай увагі працягваюць заставацца шматдзетныя сем'і і ваенныя. Зыходзячы з гэтага, і адбывалася размеркаванне жылых памяшканняў.

Так, у аб'ектах Мінска для чаргавікоў адміністрацый раёнаў была прадугледжана 1371 кватэра, у малых гарадах і Смалявічах — 188 кватэр. Па месцы работы ў дзяржаўных органах, на прадпрыемствах і ў арганізацыях сталіцы атрымалі магчымасць пабудаваць жыллё 495 сем'яў, у Смалявічах — 88 работнікаў прадпрыемстваў і арганізацый Мінска.

**Паводле БелТА.**